*Т.А.Сапега*

# АСАБЛІВАСЦІ ПРАЦЭСУ ВЫВУЧЭННЯ КНІГ ПРЫ ПРАЕКТАВАННІ МУЗЕЙНАЙ ЭКСПАЗІЦЫІ

Навуковая падрыхтоўка музейных прадметаў да экспанавання ўключае два ўзаемазвязаныя працэсы – вывучэнне музейных прадметаў і фіксацыю атрыманых ведаў [2].

Вывучэнне кніг-музейных прадметаў пры праектаванні экспазіцыі складаецца з наступных этапаў: 1) вызначэння прымет кнігі; 2) аналізу прымет кнігі, істотных для выяўлення сувязі з тэмай; 3) сістэматызацыі кніг; 4) інтэрпрэтацыі кніг.

Увядзенне этапу вызначэння прымет кнігі, не характэрнага для іншых тыпаў музейных прадметаў, выклікана недаследаванасцю музейных кніжных калекцый. Як сведчыць статыстыка з музеяў Рэспублікі Беларусь, з агульнай колькасці музейных рэчаў колькасць старадрукаў, якія прайшлі навуковую інвентарызацыю, складае 29,5 %, друкаваных выданняў – 49,1 %. Недастатковы ўзровень навуковай інвентарызацыі кніг-музейных прадметаў, безумоўна, уплывае і на якасць навукова-экспазіцыйнай дзейнасці. Паказальна, што ў 2002 г. экспанавалася толькі 4,4 % старадрукаў і 6,8 % друкаваных выданняў [1, с. 65]. На гэтым этапе экспазіцыянеру часта даводзіцца не толькі даследаваць сувязь прымет з тэмай, але і выяўляць, супастаўляць самі прыметы кнігі, дапаўняць і паглыбляць звесткі, якія атрыманы пры апісанні на першай ступені ўліку ў фондавым аддзеле, аргументаваць іх шляхам паглыбленага вывучэння і апісання. Ускладняюцца працэсы сістэматызацыі і інтэрпрэтацыі кніг-музейных прадметаў. Пры гэтым экспазіцыянер не вырашае цалкам тых задач, якія стаяць перад супрацоўнікамі фондавых аддзелаў, бо ён зыходзіць з патрэбы раскрыць канкрэтную экспазіцыйную тэму.

На этапе аналізу прымет кнігі экспазіцыянер перш за ўсё аналізуе прыметы прадмета, удакладняе яго якасці і вызначае сувязь прадмета з тэматыкай экспазіцыі. Аналіз адносін

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадмета да тэмы дазваляе вылучыць з шэрага шматлікіх прымет істотныя для раскрыцця тэмы. У выніку такога даследавання можа высветліцца, што прадмет па тых ці іншых прыметах немэтазгодна змяшчаць у экспазіцыі. Адной з такіх істотных падстаў з’яўляецца немагчымасць забяспечыць захаванне прадмета, напрыклад зберагчы кнігу ад выцвітання.

Калі ж кніга была вывучана да падрыхтоўкі экспазіцыі, то першы этап па выяўленні прымет кнігі не ажыццяўляецца, і праца экспазіцыянера пачынаецца з другога этапу. Экспазіцыянер абапіраецца на даследаванні кніг-музейных прадметаў, што праводзяцца ў фондавых аддзелах. Поспех яго працы залежыць у значнай ступені ад таго, наколькі поўна вывучаны прадметы, што захоўваюцца ў фондах. Інфармацыя, якую ўтрымлівае ў сабе любы музейны прадмет, шматгранная. Кніга можа цікавіць гісторыка не толькі як крыніца, у тэксце якой змешчаны пэўныя факты, але і таму, што адлюстроўвае ўзровень і шляхі развіцця навукі і тэхнікі, сацыяльныя працэсы, эстэтычныя погляды і інш. У задачу супрацоўніка фондавага аддзела ўваходзіць выяўленне ўсіх прымет прадмета (атрыбуцыя), існуючых паміж прадметамі ўзаемасувязей (класіфікацыя і сістэматызацыя). У выніку экспазіцыянер атрымлівае зыходныя звесткі, якія характарызуюць усю сукупнасць якасцей даследуемага прадмета і дазваляюць вызначыць яго значнасць (інтэрпрэтаваць) як крыніцу ведаў і эмоцый.

Задача экспазіцыянера мае канкрэтную накіраванасць. Музейны прадмет яго цікавіць як крыніца інфармацыі, звязаная менавіта з тэмай экспазіцыі. Узаемасувязі, што існуюць паміж прадметамі, таксама разглядаюцца у іх суадносінах з экспазіцыйнай тэмай. Для фондавых супрацоўнікаў практыкуецца спецыялізацыя ў галіне вывучэння крыніц пэўнага тыпу: рэчавых, выяўленчых і пісьмовых. Абмежавацца спецыялізацыяй у галіне вывучэння прадметаў аднаго тыпу экспазіцыянеру немагчыма. Паглыбленае вывучэнне канкрэтнай тэмы, комплексны падыход да прадметаў дазваляюць не толькі праверыць і ўдакладніць даныя пра прадмет, але і значна іх дапоўніць. Для экспазіцыянера важна ацаніць сілу ўздзеяння прадмета на наведвальніка, і ён звяртае вялікую ўвагу на атракцыйныя і экспрэсіўныя якасці прадмета. Пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўключэнні прадмета ў канкрэтны тэматыка-экспазіцыйны комплекс гэтыя якасці могуць узмацняцца ці паслабляцца, што таксама выяўляецца і ўлічваецца экспазіцыянерам.

Пры сістэматызацыі кніг экспазіцыянера цікавяць сувязі з тэмай не толькі асобных музейных прадметаў, а ўсёй іх сукупнасці. У яго задачу ўваходзіць выяўленне роднасці і адрознення ўсіх прадметаў. Сістэматызацыя дазваляе супаставіць магчымасці музейных прадметаў як крыніц інфармацыі па тэме і дапамагае аб'яднаць іх у тэматыка-экспазіцыйныя комплексы.

Экспазіцыянер сістэматызуе менавіта тыя прадметы, адносіны якіх да распрацоўваемай тэмы ўжо выяўлены. У задачу экспазіцыянера ўваходзіць выяўленне ўсіх музейных прадметаў, неабходных для раскрыцця тэмы, і перш за ўсё тых, што маюць генетычныя сувязі з разглядаемай з'явай. Музейныя прадметы, якімі валодае экспазіцыянер, падзяляюць на дзве групы: генетычна звязаныя з даследуемай падзеяй і генетычна з ёй не звязаныя. Адны тэмы могуць быць у большай ступені забяспечаны генетычна звязанымі прадметамі, іншыя – у меншай. Гэта залежыць не толькі ад таго, наколькі інтэнсіўна і мэтанакіравана вядзецца камплектаванне фондаў музея, але і ад таго, наколькі гэтыя прадметы захаваны.

Часта экспазіцыянер не можа абмежавацца прадметамі, якія генетычна звязаны з вывучаемымі падзеямі, і вымушаны ўключыць у экспазіцыю музейныя прадметы, што маюць да тэмы ўскоснае дачыненне. Кніга можа быць не звязана з фактам, але па іншых прыметах прыбліжана да тэмы. Напрыклад, кніга той эпохі, у якую адбываліся пэўныя падзеі. Пры стварэнні экспазіцыі, прысвечанай гісторыі і культуры Беларусі першай паловы XIX ст., у экспазіцыю могуць увайсці кнігі, генетычна звязаныя з тэмай (кнігі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Адама Міцкевіча, Яна Чачота) і выдадзеныя ў гэты перыяд ("Полацкі месячнік", ілюстраваны літаратурна-навуковы часопіс, які выдаваўся Полацкай акадэміяй, і інш.). Экспанатамі, што генетычна не звязаны з тэмай, могуць быць заходнееўрапейскія кнігі XVIII ст., але з пячаткай бібліятэкі Полацкага калегіума, на базе якога ў 1812 г. была адкрыта Полацкая езуіцкая акадэмія.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прадметы, што ўваходзяць у першую групу, падзяляюцца на дзве падгрупы: генетычна звязаныя ўсімі прыметамі з тэмай і звязаныя толькі асобнымі прыметамі. Група музейных прадметаў, што не мае генетычнай сувязі з тэмай, таксама не аднародная. У адну падгрупу ўваходзяць прадметы, прыбліжана звязаныя з тэмай зместам, прызначэннем, часам стварэння. У другую – прадметы рэтраспектыўнага характару, прысвечаныя разглядаемым падзеям, але якія не з'яўляюцца першакрыніцамі для іх вывучэння.

Экспазіцыянер стварае картатэку, дзе ўлічвае адабраныя музейныя прадметы і звесткі пра іх. Экспазіцыйная картка адрозніваецца ад карткі фондавай картатэкі зместам, бо ўключае дадатковыя звесткі пра прадмет, якія былі выяўлены ці ўдакладнены ў працэсе вывучэння музейных прадметаў і падрыхтоўкі да экспанавання. Калі ўсе прыметы прадмета, выяўленыя на першым этапе ці ў фондавым аддзеле музея, з'яўляюцца істотнымі, то яны пераносяцца ў экспазіцыйную картку. У іншым выпадку ў картку прыметы пераносяцца выбарачна, гэта значыць толькі тыя звесткі, якія важныя для экспазіцыянера. Такім чынам, у экспазіцыйнай картцы фіксуюцца:

а) прыметы прадмета, істотныя для раскрыцця тэмы;

б) наяўнасць ці адсутнасць генетычнай сувязі з падзеяй;

в) літаратура і іншыя крыніцы, што прысвечаны вывучаемаму прадмету.

Экспазіцыйныя карткі сістэматызуюцца па тэматычнай прымеце, што дае магчымасць дакладна вызначыць, наколькі тэма забяспечана музейнымі прадметамі і якія раздзелы патрабуюць дапаўнення. Такая экспазіцыйная картатэка нярэдка сведчыць пра неабходнасць вярнуцца да падбору прадметаў у фондзе, правесці дадатковае камплектаванне музейных прадметаў, а таксама папрацаваць у фондах іншых музеяў, архіваў, бібліятэк. Даныя гэтай картатэкі ў значнай ступені вызначаюць працу па падборы і стварэнні навукова-дапаможных матэрыялаў і служаць асновай для стварэння тэматычна-экспазіцыйных комплексаў. Важна, каб у картатэцы экспазіцыянера знаходзіліся карткі не толькі на прадметы, адабраныя для экспанавання, але і на тыя, якія былі адабраны для папярэдняга прагляду. Гэтыя карткі групуюцца ў асобныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рубрыкі, што адпавядаюць рубрыкам картатэкі на адабраныя прадметы. Яны аказваюць дапамогу экспазіцыянеру, калі неабходна замяніць экспанат пры мантажы экспазіцыі (часта па тэхнічных падставах) або ў экспазіцыі. У спецыяльныя рубрыкі выносяцца карткі на прадметы, якія не могуць быць экспанаваны з-за немагчымасці забяспечыць іх захаванасць, з-за прыналежнасці да іншага музея, архіва, бібліятэкі і інш. Гэта дазваляе дакладна вызначыць, з якіх прадметаў неабходна зрабіць копіі. У далейшым картатэка дапаўняецца карткамі на навукова-дапаможныя матэрыялы.

Картатэка, створаная экспазіцыянерам у працэсе вывучэння музейных прадметаў, выкарыстоўваецца:

– пры падрыхтоўцы кніг-музейных прадметаў да экспанавання. Картатэка дазваляе згрупаваць прадметы ў тэматычнай паслядоўнасці, выявіць, наколькі поўна забяспечана тэма першакрыніцамі. Асабліва гэта важна для работы па стварэнні тэматыка-экспазіцыйных комплексаў;

– пры складанні этыкетажу. Зафіксаваныя ў экспазіцыйнай картцы даныя пра прадмет дазваляюць дакладна, поўна і лаканічна даць неабходныя звесткі пра яго наведвальніку. Па картцы экспазіцыянер можа хутка адабраць даныя, неабходныя для фармальнай характарыстыкі экспанатаў, а таксама даныя, што раскрываюць значнасць экспанатаў у асвятленні тэмы. Карткі дапамагаюць пазбегнуць з’яўлення ў этыкетажы памылак;

– пры падрыхтоўцы экскурсаводаў, якія з карткі могуць атрымаць разгорнутыя і сістэматызаваныя звесткі пра прадмет;

– супрацоўнікамі фондавых аддзелаў, напрыклад пры складанні ці ўдакладненні агульнамузейнай тэматычнай картатэкі;

– экспазіцыянерамі, што працуюць над сумежнымі тэмамі;

– пры кансультаванні супрацоўнікаў іншых музеяў, устаноў і наведвальнікаў, якія праявілі асаблівы інтарэс да пэўнага раздзела экспазіцыі ці асобных экспанатаў.

Вывучэнне кнігі-музейнага прадмета, неабходнае для экспанавання, можна лічыць завершаным толькі пасля супастаўлення вынікаў даследавання: суаднясення прымет

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадмета з тэмай і выяўлення яго месца ў шэрагу іншых прадметаў, што адносяцца да тэмы. На аснове такога супастаўлення музейны прадмет інтэрпрэтуецца як экспанат.

Атрыманая ў ходзе навуковага даследавання інфармацыя пра кнігу, апрацаваная і зафіксаваная належным чынам у адпаведнай дакументацыі, ствярае аснову для яе далейшага выкарыстання. Аналіз сабранай інфармацыі дае магчымасць раскрыць і канкрэтызаваць музейную каштоўнасць кнігі, якая вызначае яе месца і значэнне сярод іншых помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры.

---

1. *Статыстычны* партрэт культуры Беларусі: Агляд тэатр.-відовішч. культур.-асвет. і навуч. устаноў сістэмы М-ва культуры Рэспублікі Беларусь / Бел. дзярж. ін-т праблем культуры. – Мн., 2003.

2. *Финягина Н.П.* Научная подготовка музейных предметов при создании экспозиций в музеях исторического профиля // Проблемы экспозиционной и научно-просветительной работы музеев: Тр. / Государственный ордена Ленина исторический музей. – М., 1982. – С. 26–43.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ